| наш | ваш | шы́шкі | шпак |
| на́ша | ва́ша | ша́шкі | шпакі́ |
| на́шы | ва́шы | пту́шкі | шпако́ўня |

У вавёркі мале́нькія ву́шкі, а ў слана́ вялі́кія ву́шы.

У ко́шкі мя́ккая шэ́рстка. А ў  яка́я шэрсць?

У бегемо́та каро́ткая шы́я. А ў  яка́я шы́я?

?

Прыйшла́ вясна́. Прыгрэ́ла со́нейка. Раста́ў снег. Вось-вось прыляця́ць шпакі́. Гры́ша і Але́сь вы́рашылі змайстрава́ць пту́шкам шпако́ўні.

Гры́ша вы́пілаваў акура́тныя загато́ўкі. Але́сь стара́нна змацава́ў загато́ўкі ў тры шпако́ўні. Юныя майстры́ паве́сілі шпако́ўні на старо́й гру́шы.

Прыляце́лі шпакі́ і занялі́ свае́ ўту́льныя кватэ́ры. Усю́ вясну́ і ле́та пту́шкі спява́лі зво́нкія пе́сні Гры́шу і Але́сю.



к й я ю е ё з в б ц ь ш



Правообладатель Академия образования

| | | |
|---|---|---|
| шко́ла | пе́ршы клас | сшы́так |
| шко́ль-ні-ца | пер-ша-кла́-сні-ца | сшы́ткі |



Я́ша
Мі́ша
Ма́ша
Да́ша
Па́ша
Са́ша
Лу́ша
Лёша
Алёша
Гры́ша
Ната́ша

| | | |
|---|---|---|
| рашы́ | раша́й | шука́й |
| рашы́ў | раша́ў | шука́ў |
| рашы́ла | раша́ла | шука́ла |
| рашы́лі | раша́лі | шука́лі |

## Першакла́сніца

Ма́ша — шко́льніца. Сёлета ўво́сень яна́ пайшла́ ў пе́ршы клас. Яна́ — першакла́сніца.

Ма́ша ву́чыцца чыта́ць, піса́ць, лічы́ць і раша́ць. Ёй усё ціка́ва. У Ма́шы шмат кніг. Гэ́та «Буква́р», «Матэма́тыка», «Чалаве́к і свет».

У Ма́шы ёсць про́пісі і сшы́ткі. Мала́я вучані́ца акура́тна пі́ша лі́тары, лі́чбы, сло́вы і ска́зы. Ма́ша стара́нна ву́чыцца ў шко́ле. А ты?





Чаму́ яшчэ́ ву́чаць у шко́ле?

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н




шко́ла
шкала́




Яка́я шко́ла?
Што ёсць у шко́ле?

На́ша шко́ла ... .
У шко́ле ... .

Чыта́й! Шука́й!



Шо Шу Шы Ша Шэ

У яко́га гно́ма сі́нія шо́рты, шэ́рая камізэ́лька і сі́няя ша́пка? Яко́га ко́леру ў яго́ шкар-пэ́-ткі?

У яко́га гно́ма зялёныя штаны́, шэ́ры сві́тар і зялёная ша́пка? Яко́га ко́леру ў яго́ шкарпэ́ткі?

У яко́га гно́ма зялёныя шо́рты, камізэ́лька ў клётку і бе́лая кашу́ля? Яко́га ко́леру ў яго́ шкарпэ́ткі?

Апішы́ гно́маў Шо і Шэ.

к й я ю е ё з в б ц ь ш



Правообладатель Академия образования

# Х х














х





х




 Ах! Ох! Ух! Эх!

ха
хо
ху
хі
хе



мех



хор



хаке́й



хурма́





У Белару́сі шмат хра́маў.

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

| | | | |
|---|---|---|---|
| храм | хма́ра | хвілі́на | Хрысці́на |
| хлеб | хма́рка | хмуры́на | Хрысці́нка |

### Гульня́ «Рэ́ха»

Смех — мех, мех, мех.
Схапі́ць — піць, піць, піць.

Хма́ра — … .
Хва́ля — … .

## Хма́рка-кве́тка

На клу́мбе ў Хрысці́ны раслі́ ро́зныя кве́ткі. Яна́ пало́ла і паліва́ла іх. У во́льную хвілі́ну Хрысці́нка назіра́ла за хма́рамі.

Не́як ра́нкам Хрысці́на пры-кме́-ці-ла хмуры́нку, яка́я ўвесь час змяня́лася. Яна́ напаміна́ла то хрызантэ́му, то рамо́нак, то вало́шку. Гэ́тая хма́рка назіра́ла за кве́ткамі на клу́мбе і паўтара́ла іх абры́сы.



Хрысці́нка прыве́тна памаха́ла руко́й мало́й хма́рцы. Та́я набыла́ абры́с рукаві́чкі. Так хмуры́нка паві́та́лася з Хрысці́нкай.





Правообладатель Академия образования

# Жж














ж





ж



ж а
жу
жы
жо
жэ


жа́ба


жы́та


во́жык


жэле́


жаўру́к


кажу́х

Жж

Жук, жа́ба, жо́раў, жаўру́к, во́жык — гэ́та жывёла.

Хто жыве́ ў ле́се?
Хто жыве́ на бало́це?
Раскажы́ Жэ́ўжыку.



с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

жаўру́к жо́раў го́жы
жа́варанак жураве́ль прыго́жы



Як па-і́ншаму называ́ецца жо́раў?
Як па-і́ншаму называ́ецца жа́варанак?

## Жураўлі́

Жураўлі́ — ве́льмі прыго́жыя пту́шкі. Яны́ высо́кія і мо́цныя. Між пту́шак жо́равы — ле́пшыя танцо́ры. Ве́льмі хо́раша гэ́тыя пта́хі танцу́юць ра́ніцай. Спача́тку яны́ кла́няюцца, распуска́юць кры́лы. По́тым злята́юцца ў круг і ска́чуць. Жураўлі́ бы́ццам гуля́юць у вясёлую гульню́.



Назіра́ць за іх та́нцамі ціка́ва. Але́ заўва́жыць гэ́тых пту́шак няпро́ста. Яны́ жыву́ць на бало́тах у глухі́х мясці́нах.

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж



Правообладатель Академия образования

жы жа жо жу жэ
шы ша шо шу шэ

кашы́ — кош
нажы́ — нож
гаражы́ — гара́ж

карашо́к — карашкі́
ражо́к — ражкі́
кружо́к — кружкі́

## Што лі́шняе? Чаму́?

| | | | |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| ры́жык | мухамо́р | смаржо́к | сырае́жка |
|  |  |  |  |
| ру́жа | ажы́ны | журaві́ны | маро́шка |

## Хто лі́шні? Чаму́?

| | | | |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| чыж | стрыж | смоўж | жаўна́ |

## Скажы́ іна́кш!



сцю́жа — маро́з
жму́ркі — хо́ванкі

смоўж — слімáк
жаўна́ — …

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н



Ла́стаўкі, жа́варанкі, жураўлі́ — пералётныя пту́шкі. Усе́ яны́ во́сенню ляця́ць у вы́рай, а вясно́й вярта́юцца.

Пе́ршымі з вы́раю вярта́юцца жаўрукі́. Іх сустрака́юць пе́сенькай-замо́вай:

Жаваро́начкі, прыляці́це,
Цёпла ле́цейка прынясі́це!



## Жураві́ны

На бало́це жураўлі́ным
Мы шука́ем
Жураві́ны.

Жураві́ны мы збіра́ем —
Вам, сябры́,
Такса́ма ра́ім.

Уладзімір Мазго.



Чаму́ бало́та назва́на жураўлі́ным?
Чым кары́сныя жураві́ны?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж



Правообладатель Академия образования

# Д д

# Дд












д





д



да

ду

ды

до

дэ



дуда́



ду́дачка



дало́нь



дэсе́рт



до́лька



дыва́н






дро́вы
дрэ́вы





Гэ́ты сі́мвал —
дрэ́ва жыцця́.

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

вада́ ве́ды до́ўгі ро́дны
во́ды ве́даць до́ўгія ро́дная

## Рэ́кі Белару́сі

У ро́днай Белару́сі мно́га рэк. Усе́ ма́юць свае́ на́звы.

Са́мыя буйны́я рэ́кі Белару́сі — Днепр, Нёман, Буг, Пры́пяць, Сож, Бя-рэ́-зі-на.

Днепр — адна́ з гало́ўных рэк Еўро́пы. Днепр цячэ́ па Белару́сі, Украі́не і Расі́і.

Нёман — адна́ з до́ўгіх рэк. Нёман нясе́ свае́ во́ды па Белару́сі, Літве́ і Расі́і.

Ві́лія — са́мая звілі́стая рака́.

Які́я яшчэ́ рэ́кі Белару́сі ты ве́даеш?





Зада́нне. Даве́дайся, яка́я на́зва ў ракі́ твайго́ ро́днага кра́ю. Чаму́ ў яе́ така́я на́зва?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д



Правообладатель Академия образования

ды та́ до ду дэ

ды да до ду дэ
ты та то ту тэ



платы́ — плот
плады́ — плод



сады́ — сад
сляды́ — след

кле́тка
кла́дка

ка́дка
ду́дка

## Які́я быва́юць сло́вы?



Слоў са́мых ро́зных
у мо́ве бага́та.
Ро́дныя сло́вы —
ма́ма і та́та.
Му́дрыя сло́вы —
ро́зум, вучэ́нне.



Сма́чныя сло́вы —
торт і пячэ́нне.



Ціка́выя сло́вы —
вы́думка, ка́зка.



Ве́тлыя сло́вы —
быва́й, калі́ ла́ска.



Які́я яшчэ́ быва́юць сло́вы?
Які́я до́брыя сло́вы ты ве́даеш?

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

# Ні́начцы балі́ць

Скака́ла Ні́на па ха́це, скака́ла і вы́цяла но́жку аб усло́н. Ні́на аж на падло́гу се́ла ад бо́лю. Сха-пі́-ла-ся за но́жку, але́ не запла́кала.



А Пе́трык ра́птам на ўвесь го́лас як загало́сіць.

— Што з табо́ю? — кі́нулася да яго́ ма́ці.

— Балі́ць.

— Што?

— Но́жка ў Ні́ны балі́ць, — зару́мзаў ён, разма́зваючы слёзы.

Ма́ці і Ні́на смяю́цца, а Пе́трык пла́ча.

Васі́ль Хомчанка.



Чаму́ смяя́ліся ма́ці і Ні́на?
Чаму́ пла́каў Пе́трык?
Ці мо́жна назва́ць яго́ до́брым, чу́лым?





?

салóдкая ка́зка



к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д



Правообладатель Академия образования

# Дз















дз





дз



ДЗ



дзі
дзя
дзю
дзе
дзё



дзіця́



дзед



дзю́ба



дзённік



дзя́дзя



дзяў-чын-ка

дзік
дзя́цел
дзве́ры

дзень
дзянёк
дзянькі́

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

## Дні ты́дня

Сем дзён — гэ́та ты́дзень. Панядзе́лак, аўто́рак, серада́, чацве́р, пя́тніца, субо́та, нядзе́ля — гэ́та дні ты́дня. Нядзе́ля — выхадны́ дзень. А які́я аста́тнія дні?



Адкажы́ на пыта́нні.

Які́ дзень ідзе́ за панядзе́лкам?
Які́ дзень ідзе́ пасля́ нядзе́лі?



Вы́канай зада́нне.

Пералічы́ дні ты́дня ў адваро́тным пара́дку.

## Ме́сяцы го́да

Ко́лькі ме́сяцаў у го́дзе? Палічы́!






| | | | |
|---|---|---|---|
| сне́жань | сакаві́к | чэ́рвень | ве́расень |
| сту́дзень | красаві́к | лі́пень | кастры́чнік |
| лю́ты | май | жні́вень | лістапа́д |



Адкажы́ на пыта́нні.

Які́ пе́ршы ме́сяц го́да? Які́ апо́шні?
У які́м ме́сяцы ты нарадзі́ўся?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д



Правообладатель Академия образования

дзі дзя дзю дзе дзё
ці ця цю це цё

І́пуць медзь ба́цька
Пры́пяць мядзве́дзь дзя́дзька

радзі́ма лю́дзі падзе́я На́дзя
Радзі́ма сусе́дзі надзе́я Надзе́я

Белару́сь — на́ша Радзі́ма. Сталі́ца Белару́сі — го́рад Мінск. Гарады́ Брэст, Ві́цебск, Гро́дна, Го́мель, Магілёў, Мінск — а-бла-сны́-я цэ́нтры Белару́сі.

Мала́я радзі́ма — го́рад ці вёска, дзе ты на-ра-дзі́ў-ся.



Сталі́ца — гало́ўны го́рад дзяржа́вы.

**Сло́вы**



Няма́ святле́йшых слоў —
ВЯСНА́, РАДЗІ́МА, МА́ЦІ!
Ля сэ́рца іх трыма́йце
І паўтара́йце зноў…
Няма́ радне́йшых слоў.

Данута Бічэль.

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н



## Радзі́ма

— Вось мая́ радзі́ма, —
Ка́жа бра́ту Дзі́ма.
Той яго́ пыта́е:
— Дзе яна́? Яка́я?
— Вёска, рэ́чка, по́ле
Ды зялёны гай —
Гэ́та ўсё радзі́ма,
Наш цудо́ўны край.

Віктар Кудлачоў.




Дзі́на сказа́ла:

— Радзі́ма — гэ́та краі́на, на́ша дзяржа́ва.

Ула́дзік сказа́ў:

— Радзі́ма — гэ́та дом і ўсё наво́кал.

Даві́дзік сказа́ў:

— Радзі́ма — гэ́та ма́ма, та́та, дзед і бабу́ля.

Дзяні́с і На́дзя сказа́лі:

— Радзі́ма — гэ́та мы і ўсе на́шы лю́дзі!



Што тако́е Радзі́ма? Як ты ду́маеш?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д



Правообладатель Академия образования

# Дж

Дж

Дж дж









дж





дж




джа
джу
джы
джо
джэ



джэм



джа́ла



Джы́лі



джу́нглі



джо́нка



до́жджык

| | |
|---|---|
| ву́джу | саджу́ |
| ваджу́ | сяджу́ |
| хаджу́ | гляджу́ |

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

джа　　джо　　джу　　джэ　　джы
ча　　чо　　чу　　чэ　　чы

но́чы — ноч　　　ураджа́й
дажджы́ — дождж　　　ураджа́йны



Дажы́нкі — свя́та ўраджа́ю.
Белару́сы адзнача́юць яго́
ў дзень заканчэ́ння жніва́.

## Ду́май і называ́й!

агаро́джа — плот
дождж — …
ураджа́йны — …
джа́ліць — …

куса́ць
лі́вень
урадлі́вы



до́ждж
до́жджык
дажджы́
дажджы́нка
дажджаві́к
дажджлі́вы

### Смоўж

Ра́іць пчо́лка смаўжу́:
— Уцяка́й ад дажджу́,
Ад дажджу́ і гро́му
Уцяка́й дадо́му.
Смоўж смяе́цца:
— Дом жа свой
Я заўжды́ нашу́ з сабо́й.

Хведар Жычка.



к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д



Правообладатель Академия образования

# Фф

























фа
фо
фэ
фу
фы
фі
фя
фю
фе
фё



фанта́н



фо́рма



футбо́л



куфэ́рак



фе́я



фія́лка

дама
смарт — ФОН
тэле

| | | |
|---|---|---|
| фру́кты | флаг | фу́тра |
| садаві́на | сцяг | шу́ба |

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

фо́кус фігу́рны фо́та
фо́кусы фігуры́ст фато́граф
фо́куснік фігуры́стка фатагра́фія



**Фігуры́сты**

Мы ката́емся на лёдзе
І адны́, і ў караго́дзе.

Уладзімір Мацвеенка.

**Фато́граф**



На ла́ўцы ца́цкі се́лі ў рад.
Бяру́ я фо́-та-а-па-ра́т.
Усі́м смяя́цца прапану́ю.
Ува́га, я фа-та-гра-фу́-ю!

Ніна Галіноўская.

Ці ве́даеш ты, кім працу́юць бацькі́? Чым яны́ займа́юцца? Будаўні́к, прадаве́ц, наста́ўнік, музыка́нт, маста́к, журналі́ст, праграмі́ст, шафёр, фато́граф, футбалі́ст, фігуры́ст, фо́куснік…

Любы́ заня́так ціка́вы. Усе́ прафе́сіі ва́жныя. Яку́ю прафе́сію абра́ць? Ці ёсць у цябе́ ма́ра?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д ф



Правообладатель Академия образования

фла га жы фа ка
мін ра ра ра фэ

Дапамажы́ Жэ́ўжыку рашы́ць зада́чу!

Сябры́ Фаі́на, Фе́дзя і Анфі́са — аднаго́дкі.
Дзень нараджэ́ння Фаі́ны ў сакавіку́.
Дзень нараджэ́ння Фе́дзі ў сне́жні.
Дзень нараджэ́ння Анфі́сы ў сту́дзені.



?!

Хто з сябро́ў старэ́йшы?
Хто мало́дшы?
Хто старэ́йшы за Фаі́ну?
Хто мало́дшы за яе́?







— Віншу́ю цябе́ з днём нараджэ́ння!
Жада́ю табе́ по́спехаў у вучо́бе!
— Дзя́куй вялі́кі! Часту́йся, калі́ ла́ска!

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

## «Сало́дкія» фа́брыкі на́шай краі́ны

У Белару́сі шмат заво́даў і фа́брык. Усі́м до́бра вядо́мы «сало́дкія» фа́брыкі на́шай краі́ны. Тут ро́бяць ро́зныя ласу́нкі.

У Мі́нску ёсць фа́брыкі «Камуна́рка» і «Сло́дыч». Там выра́бля́юць цуке́ркі, суфле́, шакала́д, пяку́ць пячэ́нне, ва́флі.



У Го́мелі ёсць фа́брыка «Спарта́к». Яна́ вядо́ма шакала́дам, караме́ллю, то́ртамі, пячэ́ннем і піро́жнымі.

Мармела́д, зефі́р, пасцілу́, халву́, ірыс выра́бля́юць у Бабру́йску і Наро́ўлі.

Сма́чныя вы́рабы белару́скіх фа́брык заўсёды на стале́.



Даве́дайся, які́я фа́брыкі і заво́ды ёсць у тваі́м ро́дным кра́і. Лю́дзі які́х прафе́сій там працу́юць?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д ф



Правообладатель Академия образования

















п я р о





п е р ’ е





| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ья | ью | ье | ьё | ьі |
| ’я | ’ю | ’е | ’ё | ’і |

## Будзь ува́жлівы!



се́мя



купэ́



бура́н



сям’я́



куп’ё



бур’я́н




с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

| | | | |
|---|---|---|---|
| лі | пі | бі | е́хаў |
| лье | п’е | б’е | аб’е́хаў |
| лью | п’ю | б’ю | ад’е́хаў |
| льём | п’ём | б’ём | пад’е́хаў |

Прачыта́й аб’я́ву вераб’я́.




| | | | |
|---|---|---|---|
| Ма́**р’я** | па**д’е**зд | сузо́**р’е** | надво́**р’е** |
| Да́**р’я** | па**д’ё**м | су**р’ё**зна | кам**п’ю́**тар |



На́ша дру́жная сям’я́ —
Гэ́та та́та, ма́ма, я,
А яшчэ́ Дзям’я́н і Ян,
Ба́бка Ма́р’я, дзед Мар’я́н.



А яка́я ў цябе́ сям’я́? Раскажы́.



Яка́я сям’я́ ў хло́пчыка?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д ф



Правообладатель Академия образования

## Параўна́й!





п’е

ўе



## Будзь ува́жлівы!

ўі
ўе
ўю
ўё
ўя

са**ўе́** са**ўю́** са**ўё**м са**ўя**це́

сала**ўі́** сала**ўю́** сала**ўё**м сала**ўя́**мі




## Паўтары́ пра́вільна і ху́тка!

Ілья́ Салаўёў лю́біць спе́вы салаўёў.
Авяр’я́н Вераб’ёў ко́рміць зе́рнем вераб’ёў.

## Калі́ так гаво́раць?



Заліва́цца салаўём — гавары́ць прыго́жа.

Вераб’ю́ па кале́на — ве́льмі ме́лка, неглыбо́ка.



Дзе вераб’ю́ па кале́на?



с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

# Вераб’і́

Вераб’і́ знаёмыя ўсім. Чаро́дкі вераб’ёў мо́жна сустрэ́ць у любы́м двары́. Вераб’і́ жыву́ць усю́ды: у го́радзе і ў вёсцы, у по́лі і ў ле́се.



Вы назіра́лі за вераб’я́мі? Не? Дарэ́мна. Гэ́та ве́льмі ціка́ва!

Пе́р’е ў вераб’я́ шэ́рае або́ бу́рае.

Каро́ткія ла́пкі вераб’ёў без кале́няў. Таму́ хадзі́ць гэ́тыя пту́шкі не ўме́юць. Яны́ ска́чуць адра́зу на дзвюх нага́х.

Купа́юцца вераб’і́ ў лу́жыне ці ў пяску́. Так яны́ чы́сцяць сваё пе́р’е.

Вераб’і́ **ўю**ць гнёзды з галі́нак дрэў, сухо́й травы́, пу́ху і мо́ху. Са́мыя сме́лыя вераб’і́ ча́ста ла́дзяць свае́ гняздзе́чкі памі́ж пруткоў бусля́нак.





Што вас заціка́віла ў паво́дзінах вераб’ёў?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д ф



Правообладатель Академия образования



# Віншу́ем!
# Вы ўжо вы́вучылі ўсе лі́тары!



## Што ве́даеце пра лі́тары гало́сных гу́каў?

● ← а у о э і ы

| | | | |
|---|---|---|---|
| іры́с | эльф | ало́э | со́ус |
| уро́к | о́рдэн | тэа́тр | паэ́т |

●● ⇇ я ю ё е

| | | | |
|---|---|---|---|
| я́ма | е́лка | мая́к | фае́ |
| ю́нга | ёлка | каю́та | раён |

ь □, ’ □, ў □ — ●● ⇇ я ю ё е і

| | |
|---|---|
| лью | сям’я́ |
| п’ю | кап’ё |
| саўю́ | салаўі́ |



● ● — я, ю, ё, е, і

● ● — а, у, о, э, ы



## Што ве́даеце пра лі́тары зы́чных гу́каў?

Абазнача́юць

| то́лькі цвёрды гук | то́лькі мя́ккі гук |
| --- | --- |
| д ж р т ў ч ш → ● | й → ● |

Абазнача́юць цвёрды і мя́ккі гу́кі

б в г з к л м н п с ф х ц → ● а у о э ы; → ● я ю ё е і

Дзве лі́тары абазнача́юць адзі́н гук

дз → ●

дж → ●

Яка́я лі́тара гу́ка не абазнача́е?

### Буква́р

Я ў рука́х буква́р трыма́ю,
Па склада́х ужо́ чыта́ю.
Кні́жка гэ́та пе́ршая,
З ка́зкамі і ве́ршамі.
Я сяджу́, яе́ гарта́ю
І малю́нкі разгляда́ю.
У мяне́ вясёлы твар:
Маі́м ся́брам стаў буква́р!

Віктар Кудлачоў.





Правообладатель Академия образования



## Разгада́й рэ́бусы і прачыта́й сло́вы.

### МЭБЛЯ

**100 л**

**у** 

### РАСЛІНЫ

**г** 

**бу** 

### ЖЫВЁЛА

 **р**

**к** 

 **ь**



**і=о**

## БУДЫНКІ

ш 

х 

с=д 

в 

## РАКА

п 

## ВОЗЕРА

 ч



Прачыта́й сло́ва. Складзі́ з яго́ лі́тар но́выя сло́вы. Хто больш?

| ж | а | в | а | р | а | н | а | к |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|



Правообладатель Академия образования

## Ад навукі спрытнеюць рукі.

### Прачыта́й і даве́дайся!



Калі́ ўсе лі́тары ста́нуць у патрэ́бным пара́дку, атрыма́ецца АЛФАВІ́Т, або́ А́ЗБУКА.

### Алфаві́т

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Аа** | **Бб** | **Вв** | **Гг** | **Дд** | **Ее** |
| а | бэ | вэ | гэ | дэ | е |
| **Ёё** | **Жж** | **Зз** | **Іі** | **й** | |
| ё | жэ | зэ | і | і нескладовае | |
| **Кк** | **Лл** | **Мм** | **Нн** | **Оо** | **Пп** |
| ка | эл | эм | эн | о | пэ |
| **Рр** | **Сс** | **Тт** | **Уу** | **ў** | |
| эр | эс | тэ | у | у нескладовае | |
| **Фф** | **Хх** | **Цц** | **Чч** | **Шш** | **ы** |
| эф | ха | цэ | чэ | ша | ы |
| **ь** | **Ээ** | **Юю** | **Яя** | | |
| мяккі знак | э | ю | я | | |



**Бачыць вока далёка, а розум — яшчэ далей.**

А́збуку для славя́н ствары́лі браты́ Кіры́л і Мяфо́дзій шмат гадо́ў таму́.

У да́ўнія часы́ лі́тары ме́лі і́ншыя на́звы.

Прачыта́й на́звы пе́ршых лі́тар.



аз



бу́кі



ве́дзі



## Зада́нні для зна́ўцаў.

1. Які́ сказ зашыфрава́ны ў на́звах гэ́тых лі́тар алфаві́та? Вы́карыстай ключ-памо́чнік.

**Аз** — я.
**Букі** — лі́тары.
**Ведзі** — ве́даць.

2. Які́я лі́тары дапамаглі́ ўтвары́ць сло́ва «а́збука»?

## Прачыта́й і даве́дайся!



Сло́ва **«алфаві́т»** скла́дзена з на́зваў дзвюх грэ́часкіх лі́тар: **«а́льфа»** і **«ві́та»**. Яно́ старэ́йшае за сло́ва **«а́збука»**.



Правообладатель Академия образования

Век жыве́ш — век ву́чышся.

## Музе́й кні́гі

У Нацыяна́льнай бібліятэ́цы Белару́сі ёсць музе́й кні́гі. У ім сабра́ны сапра́ўдныя кні́жныя ска́рбы.

До́ўгі час папе́ру лю́дзям замяня́лі ліст́ы і сцёблы раслі́н, кара́ бяро́зы, ску́ра жывёл і шоўк.



Лісты́ для пісьма́ мацава́лі адзі́н да аднаго́. Атры́мліваўся до́ўгі руло́н — скру́так. Захо́ўвалі скру́так у футля́ры.



Staро́нкі сшыва́лі, змяшча́лі ў цвёрды пераплёт і ўпрыго́жвалі.

**Го́рка ча́сам праца, ды хлеб ад яе салодкі.**

Пе́ршыя кні́гі лю́дзі піса́лі ад рукі́. Гэ́та рабо́та была́ ве́льмі до́ўгай і ця́жкай.





Еўфрасі́ння По́лацкая прасла́віла ро́дны край сваі́мі рукапі́снымі кні́гамі. Яна́ засна-ва́ла храм, адкры́ла шко́лу, вучы́ла дзяце́й чыта́ць і піса́ць.





Францы́ск Скары́на надрукава́ў пе́ршую славя́нскую кні́гу на станку́. Ён — наш перша-друка́р.

Мы ўдзя́чныя лю́дзям, які́я ра́зам з кні́гай адкры́лі нам шлях да ве́даў.



Правообладатель Академия образования

Для ўсякай птушачкі мілае сваё гняздо.

## Наша Радзіма — Беларусь

Мы жывём у Белару́сі.

Рэспу́бліка Белару́сь — наша Радзі́ма.

Радзіма — гэта тое месца, дзе чалавек на-ра-дзіў-ся, дзе жывуць яго сваякі. Добра, калі побач мама і тата, дзяду́лі і бабулі, брацікі і сястры́чкі. Добра, калі вакол цябе ро́дная зямля́.

Усё мі́лае сэрцу: і лес, і рэчка, і дарога, якая вядзе́ да ро́днага дома.

Побач сябры́, землякі́-белару́сы. Усе любяць свой ро́дны край. Усе ве́тлівыя і заўсёды пры́йдуць на дапамогу ў ця́жкую хвілі́ну.

Мы любім нашу Беларусь. Адна́ ў чалаве́ка маці, адна ў яго і Радзі́ма.



## Добрая слава далёка ідзе.

### Беларусь

Зма́лку звалі цябе
Мы прыгожай Радзімаю.
Беларусь, Беларусь,
Як ты сэрцу любімая!
Беларусь, над табою
Неба з яснымі зорамі.
Пагляда́еш на іх
Ты вачамі-азёрамі.

Пятрусь Броўка.



**Пры 5**



**ім**



**н**



Назвы,
Родныя здавён,
Нагада́лі
Шмат імён.

Уладзімір Мазго.



Якія імёны схаваліся ў словах?

Жо́дзіна Малары́та Бары́саў Клі́мавічы



Правообладатель Академия образования

Жыццё пражыць — не песеньку спець.

## Самыя дарагія падарункі

У Івана Іва́навіча два пра́ўнукі. Але ён не любіць называць іх пра́ўнукамі, жарту́е:

— Ле́пей бу́дзьце ўнукамі. Так і я сябе ма-ла-дзе́й-шым адчуваю.

Браты́ ведаюць: дзед не́калі ваява́ў, ма́е баявы́я ўзна-га-ро́-ды. Дзед не любіць іх пака́зваць. Ды хлопчыкі ўпотай разгля́дваюць тыя медалі́ і ордэн.

На-блі-жа́ў-ся дзедаў юбілей.

— Што падары́ць табе, дзяду́ля? — пыта́ліся Ігар і Паўлік.

— Нічога не трэба, — адка́зваў дзед. — Раскажы́це лепш, што добрага зрабі́лі.



## З малога дойдзе да вялікага.

У дзень нараджэ́ння Іван Іванавіч запыта́ўся ў пра́ўнукаў:

— Чым жа вы пара́дуеце дзеда?

— Я старэ́нькую бабулю цераз вуліцу пераве́ў, — сказа́ў Паўлік.

— Я памы́ў падлогу, — паве́даміў Ігар.

— Дзядуля, глядзі, які я табе кіёк змайстрава́ў, — паказаў Паўлік палку. — Каб табе лягчэ́й хадзіць было.



— А я ўчора яшчэ чараві́кі твае пачы́сціў, — прыгада́ў Ігар.

Дзед прыгарну́ў да сябе пра́ўнукаў:

— І за кіёк дзякуй, і за чараві́кі. Для мяне гэта — са́мыя дарагі́я падару́нкі. І дале́й рабіце ў жыцці́ толькі дабро. І сваім родным, і сябра́м, і і́ншым лю́дзям.

Міхась Даніленка.



Правообладатель Академия образования

І сто гадоў мала для памяці пра подзвіг людзей.

## Будзем памятаць

Мале́нькая Іры́нка пыта́ецца ў дзеда:

— Дзядуля, чаму 9 Мая людзі нясуць кветкі да Ве́чнага агню́?

— Вечны агонь — сі́мвал памяці пра тых людзей, якія загі́нулі на вайне.

Вялі́кая Айчы́нная вайна́ до́ўжылася ама́ль чаты́ры гады́. Вайна прыйшла́ ў кожную сям'ю́.

— І ў нашу сям'ю?

— Так. Нашы пра́дзеды змагаліся на фронце з ворагам. Дзед Рыгор быў разве́дчыкам, дзед Мацвей — лётчыкам, бабуля Га́нна — медсястрой. Яны абараня́лі нашу Радзіму. Не ўсе вярнуліся дадому.



## Калі добра пастарацца, то павінна атрымацца.

Многа гора і слёз прыне́сла вайна. Таму ўсе людзі хочуць жыць у зго́дзе.

Мір — гэта чы́стае неба і яркае сонейка.

Мір — гэта ўсме́шкі людзей.

Мір — гэта мама і ўсе сваякі, якія вельмі любяць цябе.

Яшчэ доўга Іра размаўляла з дзяду́лем. Яны гарта́лі стары́ альбом, разгляда́лі фатагра́фіі.

За́раз Ірына зразуме́ла: каб шанава́ць мір, трэба па́мятаць пра подзвігі сваіх пра́дзедаў.



Даведайся, хто з тваіх сваякоў абараняў нашу Радзіму.






Правообладатель Академия образования

## Які́маўкі

Шмат садоў у на́шай вёсцы. І ў кожным садзе расту́ць які́маўкі. Яны нічы́м не адро́зніваюцца ад звыча́йных антонавак. Чаму ж іх так назва́лі? А вось чаму.

Гадоў тры́ццаць таму жыў у вёсцы стары́ Які́м. І быў у яго вялікі сад. Мы хадзі́лі туды́ ла́савацца яблыкамі. Дзяду́ля частава́ў нас духмя́нымі антонаўкамі і прыгаворваў:

— Я́блык у роцік, а здароўе ў жывоцік.

А потым пытаў:

— Сма́чныя?



— Смачныя! — адка́звалі мы.

— Е́шце, дзеткі, а се́мечкі з гэтых яблыкаў захава́йце і пасадзі́це на сваі́м агародзе каля плота. Калі з’я́вяцца па́расткі, мяне паклі́чце. Я прышчэ́пку зраблю́. І праз не́калькі гадоў будуць у вас такі́я ж я́блыкі.

І сапраўды́, праз якія год-два каля плота з’яў-ля́-лі-ся па́расткі. Мы клі́калі старо́га Які́ма, і ён пры-шчэ́-плі-ваў дрэўцы.

Прышчэ́пліваў антонаўкай. Але ў знак удзя́чнасці лю́дзі называ́лі я́блыкі які́маўкамі.

Мікола Янчанка.





Правообладатель Академия образования

**Не заменіш работы словам.**



## Размеркаваў

— Возьмемся за працу ўсе!
Кожны дрэўца прынясе.
Коля з Ігарам — рыдлёўкі,
Міша — лейку, ты — вяроўку.
А я стану правяраць,
Як хто будзе працаваць.

Раптам Коля не стрыва́ў:
— Добра ж ты размеркаваў.
Будзеш правяраць. А хто ты,
Што цура́ешся работы?
Ты рыдлёўку лепш бяры,
Як усе твае сябры!

Тадзіяна Кляшторная.



Праца нікога не крыўдзіць.

## Дапамагу́



На гародзе ў бабулі
Многа морквы і цыбулі,
Памідораў, агуркоў,
Часнаку́ і буракоў.
Я на гра́ды пабягу
І бабулі памагу.
Моркву з рэпай прапалю́,
А пасля гуркі пальё́.

Тадзіяна Кляшторная.



Мы ўмеем працаваць і бацька́м дапамагаць.



Правообладатель Академия образования

Раз зманіш — другі не паверацць.

## Цукеркі

Мама купіла цукерак і паклала ў ша́фу. Вечарам дастала цукеркі, а іх толькі пало́ва за-ста-ла́-ся.

— Пры-зна-ва́й-це-ся, хто браў цукеркі? — спытала яна.

— Я не брала, — сказала Аленка.

— І я не браў, — апусціў вочы Сяргейка.

Маці сказала Сяргейку:

— Калі не браў, то скажы «чэснае слова».



Сяргейка пасоп носам, пераступіў з нагі на нагу:

— Няхай лепш Аленка скажа «чэснае слова».

— Усё зра-зу-ме-ла, — усміхнулася маці. — Дрэнна, калі лазяць у шафу і дазволу не пытаюць.

Сяргейка аж падскочыў:

— А я спытаў бы, дык не было нікога дома. Чэснае слова, не было!

Васіль Хомчанка.

## Слова ласкавае, што дзень ясны.



### Ветлівыя словы

— Калі ласка, дзякуй,
Добры дзень —
Ветлівыя словы я
Чую ад людзей.
Я таксама імі буду
даражы́ць,
З ветлівымі словамі
Лёгка жыць.

Тадзіяна Кляшторная.



Расці, дрэўца,
Расці, траўка,
Расці, краска,
Калі ласка.
Я вас не забуду —
Паліваць вас буду.

Васіль Жуковіч.



Кра́ска — кветка.



Правообладатель Академия образования

Там, дзе згода, заўсёды добрая прыгода.



## Мы ўсё можам

Гэта праўда, што на свеце
Ёсць яшчэ такія дзеці,
Што не ўмеюць
Малява́ць,
Шыць, ляпіць і пілава́ць,
Лялькам хаткі будава́ць?

А ці праўда, што на свеце
Ёсць яшчэ такія дзеці,
Што лянуюцца спяваць,
У ладкі пля́скаць, танцава́ць?

— Гэта, цётачка, не мы!
Мы з іна́кшае гурмы́.

Мы што хо́чаце змай-стру́-ем,
І спяём, і па-тан-цу́-ем.

Еўдакія Лось.



Гурма́ — група, гурт.

У няўмечкі не баляць ні ручкі, ні плечкі.

## На́та маму любіць на́дта

Мама мы́е раму,
Ходзіць мама ў краму.
І ў дачушкі Наты
Цэлы дзень заня́ты:
То шукае маму,
То гука́е маму:
— Мама,
дзе піжама?
— Мама,
дзе панама?
— Мама,
дзе праграма?..
Мама.
Мама.
Мама.
Ледзь прачне́цца Ната,
Шу́му поўна хата,
Поўна шуму, га́му,
Бо дачушка Ната
На́дта
Любіць маму.

Рыгор Барадулін.





Правообладатель Академия образования

Добраму ўсюды добра.

## Такіх кветак не бывае

Неяк гэтым летам мая суседка Таня збірала на лузе кветкі: рамонкі, глухую крапіву́, трыпу́тнік. Яна паказвала іх мне і казала:

— Во якая прыгожая кветка!.. І гэта прыгожая... І вось гэта. Я занясу іх бабулі.

— А ты пашукай не-пры-го-жу-ю, — сказаў я. — Самую непрыгожую.

Таня ўважліва па-гля-дзе-ла мне ў вочы і за-ду-ма-ла-ся.

— Такіх кветак не бывае, — нарэшце сказала яна.

Потым яшчэ падумала і рашу́ча запэ́ўніла:

— Нідзе не бывае!

Вісарыён Гарбук.



## Куфэрак проста адчыняўся.



Ці бываюць у кветак розныя назвы?



Я — трыпутнік, падарожнік,
Чалавеку — ежа, лекі.
Хто ў бядзе яму паможа,
Як няма нідзе аптэкі?



Там не злосная трава
Забуяла ўпотай,
Там — глухая крапіва́,
Што завуць ясноткай.



Рамонкі — сонейкавы дзеткі —
Глядзя́ць так здзі́ўлена-шчаслі́ва:
Прыволле, рэчка, луг і кветкі
І аблачынак белых дзіва.

Віктар Кажура.



Як па-іншаму называюць трыпутнік?
Якую другую назву мае яснотка?
Якія кветкі паэт назваў дзеткамі сонейка?



Правообладатель Академия образования

**Хлеб — усяму галава.**

## Хлебныя крошкі

Я не-а-ха́й-на адлама́ў кава́лак хлеба. Крошкі так і па-сы́-па-лі-ся на падлогу. Уба́чыла гэта бабуля і а-бу-ры́-ла-ся:

— Ты што, хочаш голад наклі́каць?

— Як гэта голад? — здзіві́ўся я.



— А так. Падбярэ́ крошкі павук і па сваёй павуці́не на ліпу палé зе. Так і дав́едаецца сонца, што людзі яго дары́ не шану́юць. Раззлуе́цца яно і спа́ліць гарачымі промнямі жыта на полі. Вось і пачне́цца тады́ голад.

Спа-ло́-хаў-ся я. Бач, якую бяду мог на-клі́каць. Таму адразу папрасіў прабачэ́ння:

— Дару́й, бабуля! Больш так не буду.

— Ведаю, што не будзеш, — па-ла-га-дне́-ла бабуля. — А калі захочаш хлеба — вазьмі нож і адрэж скібачку. Цяпер жа збяры́ гэтыя крошкі ў жменьку ды курыцы аднясі́. Яна табе яе́чка знясе́.

Мікола Янчанка.

## Хто працуе, той і мае.

### Добра сей!

«Хочаш есці каравай —
Добра ніву засява́й!
Добра жні, чыста вей!» —
Зы́чыць ве́трык-санцаве́й.

Еўдакія Лось.












Правообладатель Академия образования





Янка Купала

## Алеся

Кукава́ла зязюля
У зялёным лесе,
Гадава́ла матуля
Дачушку Алесю.

— Спі, засні, мая́ дзетка,
Птушкі ўжо заснулі,
Спі, засні, мая кветка,
Лю́лі, люлі, люлі.

Янка Купала нарадзі́ўся ў вёсцы Вя́зынка.



## Чалавека вочы водзяць.





### Якуб Колас

# У полі

Грышка, хлопчык невялі́чкі,
У поле выйшаў з дому́,
Лю́ба там каля крыні́чкі
Хлопчыку малому.

Сядзе хлопчык над крынічкай
І не зварухне́цца:
Пазіра́е, як над дзі́чкай
Пта́шачка снуе́цца.

Якуб Колас нарадзі́ўся ў вёсцы Акі́нчыцы.





Правообладатель Академия образования

**Што напісана пяром, не выйме і сякера.**

## Родная мова



Мова родная мая́ ты,
Што і дзе́давай была!
Мова мамы, мова таты,
Мова нашага сяла!



Ты звініш, калі я ўра́нку
Чую песні за акном,
І журчы́ш, як ба́е ба́йку
Мне бабуля перад сном.



Разгарну́ буквар вясёлы —
Зноў са мной гаворыш ты,
Мілагучная заўсёды,
Як звано́чак залаты!

Ніл Гілевіч.



Пра якую мову ідзе размова ў вершы?

Шчыра сказана, як звязана.

## Мова



Лаўлю я цудоўныя,
Спеўныя словы.
Як музыку, слухаю
Родную мову.
На ёй размаўлялі
І бацька, і маці,
Заўсёды ў паша́не
Была яна ў хаце.
І зараз са мной яна
Разам ідзе,
Бо мовы, як наша,
Няма больш нідзе.

Віктар Кудлачоў.







## Родная мова

Родная мова — ма́тчына мова,
Ззя́е вясёлкай кожнае слова.
Кожная лі́тара — кропля з крыні́цы,
Колькі ні піў бы, не наталі́цца.

Лёля Багдановіч.



Правообладатель Академия образования

Разумнаму шмат талкаваць не трэба.

## Адкуль песня беларуская
(Легенда)

Ці то полем, ці то лесам ішлі́ па-да-ро́-жні-кі. Ішлі́ яны тры дні і тры ночы ды яшчэ паўдня́. Стамі́ліся. Прысе́лі. Ра́птам чу́юць — спява́е не́хта. Пры-слу́-хаў-ся першы:

— Віда́ць, жаўрук.

— Не, — кажа другі́, — гэта лес шуміць.

А трэці прыпа́ў вухам да зямлі і прашапта́ў:

— Ды гэта ж зямля наша спява́е.



Як пра цябе чуюць, так пра цябе мяркуюць.

## Мілагучнасць роднай мовы

Беларуская мова вельмі мілагу́чная. Той ёй добра валодае, хто чуе му́зыку слоў.

Возьмем хоць бы гук «дз». Напры́клад, слова «дзень» нага́двае гуча́нне струны́. Наша вуха ўжо ўлаві́ла звон сонечнай цішыні́ летняга дня, прастору чы́стага неба, палёт пчалы: дз-дз-дзень.

А возьмем кветку дзьмухаве́ц. Лёгка здагада́цца, чаму ў яе такая назва. Дзя́куючы мя́ккаму гуку «дз» слова вымаўля́ецца мякка, лагодна.

«Дзіва!» — ска́жаце вы. І сапраўды́ дзіва!

Васіль Вітка.






Правообладатель Академия образования

## Які розум, такая і гаворка.




### Мой сябра

З ім я ў працы, адпачы́нку,
На ўроку, пе-ра-пы́н-ку.

З ім я ў полі, з ім у школе,
З ім не сумна мне ніколі.

З ім вандру́ю я па свеце,
З ім лятаю ў ракеце.

Чаго сам не адгада́ю,
У яго я запыта́ю.

З ім я гутарку вяду,
З ім нідзе не прападу́.

— Хто ж ён гэтакі, скажы?
Нам яго ты пакажы.

— Не-зда-га́-длі-вы ты, Мішка…
Сябра мой, вось бачыш, — кніжка.

Адам Русак.

Якая справа, такая і слава.

## Чытаначка

Першы дождж-ык.
Мокры дах.
Мы чытаем па склада́х:
— Да-ра-гі́ бу-ква́р,
Бы-ва́й!
Ты адкрыў нам
Дзіўны край.

Блі́снуў гром з-за хмар
Залатой падкоўкай.
Пазнаёміў нас буквар
З ве́рнаю сяброўкай.
Хто палюбіў яе, таму́
Не будзе сумна аднаму́.

Рыгор Барадулін.





Кнігі сталі нам сябрамі!








Правообладатель Академия образования

## Чаму мы навучыліся? Правер сябе!



Прачытай, дапоўні сказ.




Я ведаю, што гукі мы чуем і … .

Я ведаю, што літары мы пішам і … .

Я ведаю, што гукі бываюць галосныя і … .

Я ведаю, што зычныя гукі бываюць цвёрдыя і … .

Я ведаю, што зычныя гукі бываюць звонкія і … .

Я ведаю, што ўсе літары, якія стаяць у патрэбным парадку, — гэта ... .



Падумай і адкажы.

Якая літара не абазначае гукаў?

Якія літары ў пачатку слова абазначаюць два гукі?

Якія літары заўсёды маленькія?

Якія літары абазначаюць толькі цвёрды гук?

Якая літара абазначае толькі мяккі гук?






Выразна прачытай сказы.
Звярні ўвагу на знакі прыпынку ў канцы.
Вылучай голасам патрэбныя словы.

Мы навучыліся чытаць.
Мы навучыліся чытаць?
Мы навучыліся чытаць!





*Правообладатель Академия образования*

(Назва ўстановы адукацыі)

| Наву-чальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

*Спіс выкарыстаных крыніц*


Вучэбнае выданне

**Свірыдзенка** Вольга Іванаўна
**Цірынава** Вольга Ігараўна

# БУКВАР

Вучэбны дапаможнік для 1 класа
ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

Для работы ў класе

2-е выданне, перагледжанае і дапоўненае

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Т. У. Прымачонак*
Вокладка мастака *В. М. Горбач*
Мастакі *Я. В. Грышаева, Н. Р. Жыгамонт, К. У. Максімава, А. П. Пратасеня, А. А. Тукач, Н. А. Хромава, Г.-М. А. Шпунт, В. М. Горбач, К. А. Тарасевіч*
Мастацкі рэдактар *Н. В. Музычэнка.* Камп'ютарная вёрстка *А. М. Брыкет*
Карэктары *Н. В. Федарэнка, А. А. Ліпскі*

Падпісана да друку 01.07.2024. Фармат 70×100/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 14,95. Ул.-выд. арк. 15,0. Тыраж 11 244 экз. Заказ

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Акадэмія адукацыі».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/573 ад 22.02.2024. Вул. Някрасава, 20, 220040, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск